Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# СЦЯГ СОЦЫЯЛІЗМА

ОРГАН ЧАШНІЦКАГА РК КП(б)Б І РАЁННАГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 11(117) | Чацвер, 15 лютага 1945 года | Выходзіць 2 разы ў нядзелю | Цана 15 кап.

## ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАННЕ

Ільнавалакно і ільнанасенне—прадукт неабходны краіне для мэт Айчыннай вайны, для народна-гаспадарчых мэт. А пагэтаму своечасовая здача калгасамі абавязковых ільнапаставак дзяржаве галоўнейшая ваенна-дзяржаўная задача.

Але ход выканання гэтай задачы па раёну далёка нездавальняючы. Тэрміны разліку з дзяржавай па ільнапастаўкам даўно прайшлі. А па раёну план здачы выканан толькі на 53 процанты. Друкуемая сёння зводка здачы ільнавалакна дзяржаве яскрава сведчыць аб пагражаючым становішчы, ў якім знаходзіцца зараз наш раён.

На раду з калгасамі „13 Кастрычнік", Цяпінскага сельсовета, „Прыстоі", Іванскага сельсовета (старшыня калгаса Карабань), „Ударнік", Вяжоўскага сельсовета, якія першыя разлічыліся з дзяржавай па ільнапастаўках, калгасы Лукамскага, Гілянскага, Пачаўскага і другіх сельсоветаў ганебна зрываюць здачу ільнавалакна. А па Пачаўскаму сельсовету ільнавалакно здана толькі на 9 проц. Такі калгас, як „Колас", Чарэнскага сельсовета не прыступіў нават яшчэ да здачы. Гэта тлумачыцца дрэннай арганізацыяй работы з боку старшыні калгаса Дуброўскага.

Зусім дрэнна абстаіць справа па здачы ільнанасення па Лукамскаму і Чашніцкаму сельсоветах, дзе на пункт загатлёну не прывезлі ніводнага кілаграма насення ільна. А Замацкі сельсовет разлічыўся толькі на 5 проц.

Такое становішча далей нецярпіма. І факты ганебнага адставання павінны дайсці да кожнага кіраўніка сельсовета і калгаса. Зразумеўшы вялікае значэнне здачы і нецярпімасць далейшага адставання, неабходна каб у самыя кароткія тэрміны поўнасцю разлічыцца па ільнапастаўках.

Комсамольскае жыццё

## АРГАНІЗАВАНА ПРАВЕСЦІ ЛЫЖНЫ КРОС

У нашым раёне з 18 па 25 лютага будзе праводзіцца прафсаюзна-комсамольскі лыжны крос, прысвечаны 27-ай гадавіне Чырвонай Арміі. У гэтым годзе, як і ў прайшоўшыя годы ў соцспаборніцтве будуць удзельнічаць шмат советскіх юнакоў, якія імкнуцца па прыкладу байцоў Чырвонай Арміі ўсебакова авалодаць лыжным спортам, каб быць яшчэ больш вынослівымі і лоўкімі.

Поспех кроса ў многім будзе залежыць ад правільнай і добрапастаўленай арганізацыі.

Удзельнікі кроса па праграме пройдуць па дыстанцыям: мужчыны — ад 10 да 20 км., юнакі — ад 5 да 10 км. і дзяўчаты — ад 2 да 5 км., а пагэтаму судзейская калегія павінна працаваць чотка, якой патрэбна мець дыстанцыі ўсіх размераў.

Паспяхова правесці крос — справа гонару кожнай фізкультурнай, комсамольскай і прафсаюзнай арганізацыі.

Старшыня Райсовета па справам фізкультуры і спорта
Буяльскі

## КОМСАМОЛЬСКАЯ ХРОНІКА

24 лютага г. г. з 12 гадзін дня ў памяшканні Чашніцкага кінотэатра пачне сваю работу 6-ая раённая комсамольская канферэнцыя.

РК ЛКСМБ

## АД СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

### З аператыўнай зводкі за 13 лютага

Войскі 2 Украінскага фронта, пры садзейнічанні войск 3 Украінскага фронта, па сканчэнні 1,5-месячнага акружэння ў цяжкіх умовах вялікага горада, сёння 13 лютага завяршылі разгром акружанай групіроўкі ў Будапешце і поўнасцю авалодалі горадам. У ходзе баёў узята ў палон больш 110.000 нямецкіх салдат і афіцэраў на чале з камандуючым Будапешцкай групіроўкі і разам з яго штабам. Захоплены наступныя трафеі: самалётаў—15, танкаў—269, гармат—1257, мінамётаў—476, кулямётаў—1431, бронемашын—83, аўтамашын—5153, матацыклаў—1326, павозак—3925, паравозаў—194, вагонаў—947, складаў з ваеннай маёмасцю—46. Знішчана больш 49.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

На працягу 13 лютага паўночней і паўночна-заходней Бромберг нашы войскі занялі больш 40 нас. пунктаў.

У Швайдэмюле і Пазнані вяліся баі па знішчэнню гарнізонаў праціўніка.

Паўночна-заходней гор. Ліпец нашы войскі занялі горад Белкель, а таксама больш 150 другіх нас. пунктаў. Нашы войскі акружылі у гор. Гладау гарнізон праціўніка і вялі баі па яго знішчэнню. За 12 лютага ў гэтым раёне захоплена на аэрадромах: самалётаў—345, авіяцыйных матораў—200 і ўзята ў палон больш 700 нямецкіх салдат і афіцэраў.

На другіх участках фронта—пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

На працягу 12 лютага нашы войскі падбілі і знішчылі 70 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіта 12 самалётаў праціўніка.

## ПРЫКЛАДЫ ЗАСЛУГОЎВАЮЧЫЯ ЎВАГІ

Перадавыя калгасы нашага раёна, разгарнуўшы барацьбу за дастойнае завяршэнне франтавога месячніка лесанарыхтовак і вывазак, паказваюць добрыя вынікі ў рабоце на лесанарыхтоўчых участках.

Брыгада Мухіна Нікалая з калгаса „Палітаддзелец“, Іванскага сельсовета працуе ў лесе без выезда з 26 студзеня і па 8 лютага брыгада вывезла 24,3 куб. м. лесу. Сярэдняя дзённая выработка на аднаго каня састаўляе 0,6 куб. м.

Брыгада возчыкаў Каранькова Аляксея Паўлавіча з калгаса „Ударнік“, Дварэцкага сельсовета на 6 падводах за 8 дзён вывезла 26 куб. м. дрэвясіны. Дзённая вывазка на аднаго каня састаўляе 0,78 куб. м. Асоба адзначылася тут калгасніца Семчанка Валянціна Рамануўна.

За адзін дзень 8 лютага калгаснікі Вяжоўскага с/с на 11 канях вывезлі 14,28 куб. м. Калгаснікі Іванскага сельсовета на 20 падводах вывезлі 20,25 куб. м. На адной падводзе Цяпінскага сельсовета вывезена 1,56 куб. м.

За адзін толькі дзень 11 лютага калгаснікі Лепельскага лесаўчастка на 55 канях вывезлі 170 куб. м. лесу.

Гэтыя факты заслугоўваюць увагі.

Федарэнка.

## БРАЦЬ ПРЫКЛАД З ПЕРАДАВІКОЎ

Велмі моцныя страты нанеслі акупанты народнай гаспадарцы Суражскага раёна. Калгасныя сялянства нашага раёна актыўна разгарнулі зараз збор зерневых культур у лік узаемнай дапамогі калгаснікам суражчыны.

Арганізавана прайшоў збор у Дварэцкім сельсовеце, дзе сабрана 4432 кгр. зерна і па Цяпінскаму сельсовету, дзе сабрана больш 8000 кгр. збожжа. Старшыні гэтых сельсоветаў Гардзееў, Кальверш, упаўнаважаныя РК КП(б)Б Васторгаў і Руноў па-дзелавому правялі масава-растлумачальную работу сярод калгаснікаў і добра арганізавалі збор.

Аднак недастаткова праходзіць збор па Іванскаму сельсовету. Тут пры маючыхся магчымасцях сабраць больш, сабрана толькі 1500 кгр. зерна. Тав. Любчык і Барадаўка (адказныя па збору) недастаткова арганізавалі падтрымку пачына перадавых калгасаў у аказанні дапамогі суражанам. Такое-ж становішча ў Старажавіцкім сельсовеце (адказныя Марозік і Латышаў) і Альшанскаму сельсовету (Мінёнак), дзе збор арганізаван далёка нездавальняюча. Недахопы ў рабоце трэба ўлічыць.

Маркевіч

## ЗВОДКА

аб ходзе выканання дзяржпаставак ільноваланна па Чашніцкаму раёну на 12 лютага 1945 г.

| Назва с-с | % выканання |
|---|---|
| Цяпінскі | 87 |
| Дварэцкі | 77 |
| Лазукоўскі | 74 |
| Вяжоўскі | 54 |
| Слідчанскі | 50 |
| Чарэйскі | 65 |
| Старажавіцкі | 57 |
| Замацкі | 55 |
| Іванскі | 41 |
| Альшанскі | 33 |
| Чашніцкі | 22 |
| Гілянскі | 17 |
| Вяцерскі | 23 |
| Пачаўскі | 9 |
| Лукамскі | 14 |
| па раёну | 53 |

Чашніцкі Загатлён

## ПАДАРУНКІ ШКОЛЬНІКАЎ СВАІМ ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ

Вучні Дварэцкай НСШ сабралі воінам Чырвонай Арміі, вызваліўшым Чашніцкі раён, кісетаў з табаком 29, насовачкаў 18, грашыма 400 рублёў. Кіравала зборам піонерважатая Краснік Валя 12.1.1945 г. дзеці адаслалі падарункі сваім вызваліцелям. Пачын вучняў неабходна падтрымаць другім школам.

З недалёкага мінулага

## САКРАТАР РАЙКОМА

**Л. Т. Ліцкевіч**

Але партызанскія кулі даганялі і гэтых, навекі прыціскаючы іх к зямлі. Другія падымаючы рукі ўгару і кідаючы ў жаху аб зямлю вінтоўку, насустрач партызанам крычалі: „Пан, русь гут, гут! Ніхт капут!“. Але-ж позна падымалі яны рукі, не знаходзілі памілавання і гэтыя.

Партызаны нахаду ўзрывалі тэхніку ўмацаванай абароны ворага, падбіралі трафеі, знішчалі тое, што нельга забраць.

Кальцо акружэння прарвана. На супроцьпаложным, з месца боя, канцы леса сабраліся партызаны. Чутны гукі камандыраў, выклікаючых прозвішчы сваіх байцоў, правяралі свае рады. А потым, сабраўшыся ў гурткі партызаны гутарылі аб баю. Кожны з хваляваннем размаўляў аб сваіх падзеях. Сярод іх быў і Станішэўскі, які з вясёлым тварам і добрым поглядам аглядаў сваіх герояў, змагароў за незалежнасць сваёй радзімы.

Доўга будуць памятаць „чарчукоўцы“ дзень 24 мая 1944 года. Доўга будуць памятаць яны Станішэўскага — сакратара райкома, бясвогага камандзіра, чуткага таварыша.

Доўга будуць памятаць жыхары вёскі Тоўпіна, Чашніцкага раёна адважнага партызана Станішэўскага, які не раз бываў у нашай вёсцы і натхняў насельніцтва на барацьбу з ворагам, падымаючы сярод калгаснікаў надзею на вызваленне.

І зараз калгаснікі не губляюць сувязь з Станішэўскім. Ён працуе зараз у г. Мінску, на адказнай пасадзе.

Вёска Тоўпіна, Чашніцкага раёна.

(Канец. Пачатак у № 9-10)

Адказны рэдактар А. Р. ПУХАВІЦКІ

Друкарня газеты „Сцяг Соцыялізма“ Гор. пас. Чашнікі, Ленінская вул. 18